**М. І. НАВУМЧЫК,**
настаўнік-метадыст, намеснік дырэктара
па вучэбна-метадычнай рабоце Маларыцкай раённай гімназіі

# ВЫВУЧЭННЕ АПАВЯДАННЯ ЯКУБА КОЛАСА «У СТАРЫХ ДУБАХ»

## (V клас)

### Заданні А

***Вызначце адзін ці некалькі правільных адказаў.***

**1.** Суаднясіце партрэт (фотаздымак) пісьменніка з яго прозвішчам.

1) Уладзімір Караткевіч;
2) Максім Багдановіч;
3) Максім Танк;
4) Якуб Колас;
5) Рыгор Барадулін.


1


2


3


4


5

**2.** Якуб Колас — гэта псеўданім. Сапраўднае імя пісьменніка:

1) Іван Дамінікавіч Луцэвіч;
2) Міхась Ціханавіч Лынькоў;
3) Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч;
4) Яўген Іванавіч Скурко;
5) Іван Антонавіч Брыль.

**3.** Падзеі, адлюстраваныя ў творы, адбываюцца на беразе ракі:

1) Прыпяць;
2) Нёман;
3) Сож;
4) Дняпро;
5) Заходні Буг.

**4.** Апавяданне напісана:

1) у 1909 г.;
2) 1912 г.;
3) 1917 г.;
4) 1925 г.;
5) 1936 г.

**5.** Твор падпісаны псеўданімам:

1) Мікалаевец;
2) Дзядзька Карусь;
3) Якуб Колас;
4) Тарас Гушча;
5) Наднёманец.

**6.** Апавяданне пачынаецца і заканчваецца:

1) разважаннямі аўтара пра сапраўднае сяброўства;
2) думкамі Базыля аб тым, для чаго на свеце жыве чалавек;
3) партрэтам Базыля;
4) партрэтам Грышкі;
5) апісаннем спакою і сцішанасці ў прыродзе.

**7.** Базыль і Грышка:

1) жылі па суседству, разам збягалі з урокаў, абтрасалі яблыні ў садзе дзеда Агея;
2) найлепшыя дружбакі, у іх роднасныя душы;
3) «дзве зімы ў школе сядзелі на адной лаўцы»;
4) «трэцяе лета пасуць разам кароўкі»;
5) «ні з кім яны не злучаліся і, апроч свае кампаніі, другой не хацелі».

**8.** Для Грышкі характэрныя такія рысы характару, як:

1) рухавасць і спрыт;
2) вернасць у сяброўстве;
3) неабачлівасць у паводзінах;
4) любоў да прыроды, дапытлівасць;
5) самаўпэўненасць, ганарлівасць.

**9.** «Было тут, у дубах, адно месца, дзе Базыль любіў сядзець, назіраць і думаць». Там...

1) «над абрывістым берагам Нёмана стаяў стары прысадзісты тоўсты дуб»;
2) «ад доўгіх часоў бераг, падмываемы вадою, асоваўся і агаляў тоўстыя карэнні старога дуба»;
3) «сам гэты дуб крыху пахіліўся набок, а аголены і працягнуты над вадою яго корань здаваўся нагою, і выходзіла здалёк так, што дуб збіраўся перабрысці Нёман»;
4) вясковыя рыбакі часта лавілі карасёў, шчупакоў, ляшчоў, плотак;
5) хлопцы кожны тыдзень збіраліся разам, каб пагуляць у ножык, пазагараць.

**10.** Грышку з вады дастаў (дастала):

1) Базыль;
2) маці Грышкі;
3) рыбак, які непадалёк вудзіў;
4) пастушок Васіль;
5) Янка, аднакласнік Грышкі.

**11.** Пасля таго як Базыля выцягнулі з вады і адратавалі, ён:

1) ні з кім не стаў зусім сябраваць і дзяліцца сваімі думкамі, перажываннямі;
2) стаў ціхім;
3) стаў яшчэ больш задуменным;
4) перастаў слухацца бацьку і маці, дапамагаць ім па гаспадарцы;
5) разарваў сяброўскія адносіны з Грышкам і суседскімі хлопцамі.

**12.** «Такіх дубоў цяпер рэдка дзе ўбачыш. Іх не чапала рука людская, толькі <u>доўгія часы палажылі свой след</u>...» Падкрэсленыя словы з'яўляюцца:

1) гукапісам;
2) гіпербалай;
3) метафарай;
4) параўнаннем;
5) эпітэтам.

**13.** У творы аўтар упамінае назвы птушак:

1) вароны;
2) буслы;
3) галкі;
4) сіваваронкі;
5) чаплі.

**14.** У апавяданні аўтар уздымае праблемы:

1) здрадніцтва;
2) сяброўства;
3) адносін да прыроды;
4) адказнасці за свае ўчынкі;
5) захавання прыроды, памнажэння яе багацця.

**15.** Галоўную думку твора можна суаднесці з прыказкай:

1) гуляючы, розуму не прыдбаеш;
2) пры разумнай справе і галава ў пашане;
3) з якім спазнаешся, такім і станешся;
4) дружбу ні каменем цвёрдым, ні сцяною высокаю не мераюць;
5) разумныя жарты — смеху варты, дурныя жарты — слёз варты.

**16.** Які пункт парушае ход развіцця падзей (сюжэт) у апавяданні?

1) На скошаным лузе, недалёка ад дубоў, пасвіліся статкі. Там і сям сядзелі пастушкі.
2) Базыль акінуў вокам дуб і, крыху падумаўшы, казаў: «А пэўна ёсць». І тут жа расказваў свайму сябру здарэнне з якім-небудзь асілкам.
3) Знячэўку Базыль так перапалохаўся, што ўвесь задрыжаў і падскочыў. Спужаўшыся, ён не мог ужо ўтрымацца і ссунуўся ўніз.
4) Грышка тым часам бегаў каля ракі. Якраз па тым баку ішоў з вудамі рыбак. Пабегаўшы па беразе яшчэ колькі часу, Грышка пайшоў шукаць Базыля.
5) Рыбак падбег першы. Скінуўшы адзежу, адважна кінуўся ён у ваду. Збегліся людзі.

**17.** «У леце пачыналася ўжо тая ледзь значная змена, той паварот часу, калі жыццё прыроды ідзе на спад. Скошаны луг і паскладаныя курганамі стагі, парыжэлыя ад дажджоў і сонца, ужо гаварылі аб гэтым паміранні. Буслы збіраліся ў чароды і доўга стаялі на грудах або лянiва аглядалі лагчыны. Але было прыметна, што не на пажытак пазбіраліся яны сюды, а для нейкай іншай справы. Пастаяўшы, павольна, адзін за адным, уздымаліся яны ўгару, кружыліся там, і кожны круг падымаў іх усё вышэй і вышэй. Там яны спляталіся ў адну фігуру, у адзін шырокі круг і, не махаючы крыллямі, плаўна і згодна, як па камандзе, насіліся ў неаглядным прасторы сініх нябёсаў... Асірацелыя старыя дубы ў чорных шапках бусліных гнёздаў спакойна стаялі, не варушачы ніводным лістам, і купалі ў сонцы свае адвечныя лапы».

Прыведзены ўрывак з твора называецца:

1) партрэт;
2) фотаздымак;
3) пейзаж;
4) дэталь;
5) эпізод.

**18.** Апавяданне як літаратурны жанр — гэта:

1) твор фантастычнага або бытавога зместу з шырокім выкарыстаннем вымыслу (выдумкі);
2) жанр драматычнай літаратуры, твор, у якім камічна, у смешным выглядзе паказваюцца розныя (часцей адмоўныя) з'явы жыцця з мэтай іх крытыкі;
3) звычайна празаічны твор вялікай формы, які ахоплівае вялікі адрэзак часу; яму ўласцівы разгорнуты сюжэт, складаная будова, вялікая колькасць дзейных асоб;
4) пераважна празаічны твор, мае сюжэт, развівае звычайна адну сюжэтную лінію, звязаную з галоўным героем, які паказаны ва ўзаемаадносінах з іншымі персанажамі на працягу значнага часу;
5) невялікі празаічны твор, у якім расказваецца пра асобную падзею або здарэнне ў жыцці героя, мае невялікую колькасць персанажаў, дзеянне адбываецца на працягу невялікага адрэзка часу.

**19.** «На момант, зачапіўшыся лапцем за дубовы корань, [Базыль] павіс уніз галавою над гладдзю вады, а потым шугануў... і прапаў з вачэй».

Лапці — гэта:

1) традыцыйны сялянскі абутак, плецены з лыка, пяньковых або льняных вітушак ці тонкіх вяровачак;
2) скураная або плеценая, тканая, вітая з нітак доўгая вузкая стужка для падпяразвання;

3) сарочка, асноўная частка беларускага народнага адзення;

4) невялікі мяшок з даматканай грубай тканіны з вочапкай для пераносу розных прадметаў;

5) шыты скураны абутак.

**20.** Разгадайце рэбус.




**Адказы:** 1 — 1) Уладзімір Караткевіч — 3, 2) Максім Багдановіч — 1, 3) Максім Танк — 4, 4) Якуб Колас — 2, 5) Рыгор Барадулін — 5; 2 — 3; 3 — 2; 4 — 2; 5 — 4; 6 — 5; 7 — 2—5; 8 — 1—4; 9 — 1—3; 10 — 3; 11 — 2, 3; 12 — 3; 13 — 2, 3, 4; 14 — 2, 4; 15 — 5; 16 — 3; 17 — 3; 18 — 5; 19 — 1; 20 — стары дуб.